БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12.

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраулиць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска з дастаукай да дому у Менску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш петыту на 1-й стран. 1 руб., на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 67. Менск. Субота 15 чэрвеня 1918 г. Год

АБВЕСТКА.

А падрахунку каней.

Каб установіць і абезпечыць патрэбны лік фуража знаходзячымся у Менску коням, будзе рабіцца падрахунак.

Усе коні, як:
Вогеры,
Коні,
Кабылы і
Жэрябяты

усякага веку і росту. павінны быць прыведзены па паліцэйскіх вучастках на конны пляц па Доугаброцкай вуліцы, у такім парадку:

17 чэрвеня а 9 гадз. рання вучастк. I і II,
19 « « « « « « III,
21 « « « « « « IV,
24 « « « « « « V.

Кожны уласнік павінен прывесьці сваіх каней. Коні павінны быць прыведзены вычышчэннымі і с павадамі.

За нівыпоуненння гэтаго прыказу увінавайцы забіраецца конь без грошай і ен плаціць штрафу да 1500 марак.

Менск, 12 чэрвеня 1918 г.

Камэндант
НАГЕЛЬ.
Генэрал-лейтэнант.

Польшча і яе суседзі.

Як паведамляюць тэлеграфно з Барну, Літоуская Рада падала тэлеграфны пратэст прэмьерам Францыі, Англіі і Італіі, процiу ухвалы Версальскай ваеннай рады аб стварэнні Польскай дзержавы з доступам да мора. Літоуцы знайходзяць, што гэты праэкт ні можа быць спрауджэны без нарушэння іх жыццевых інтарэсау.

Азначэны факт — падача пратэсту з боку літвіноу—нас ані дзівіць, ані здаецца чымсь такім, што-бы сьведчыло аб асобна ніпрыязных стасунках да палякоу. Гэто—натуральнае рэхо тае вяліка-дзержаунай ідэологіі, якой кіравалися у сваіх учынках «мужы стану» Польскай Рэчы Посполітай.

Час цясьнейшаго супольнаго дзержаунаго жыцця — ад Люблінскай уніі 1569 г. аж да 3 раздзелу Польшчы, а потым грамадскаго споужыцця,—ад апошняго раздзелу і да нашых дзен, павучыу суседнія с Польшчай народы асьцярожна адносіцца да запэуненняу аб братстве і спагаднасьці і як агня баяцца новаго панавання палякоу над сабой.

Ні палітыка усяго польскаго народу, разумеецца, але палітыка польскіх мужоу стану і, можна без вялікай крыўды для ісьціны сказаць, праца усей польскай інтэлігэнцыі, справіла тое, што змучанае без ушчэнай вайной за свае нацыянальныя вольнасьці казацтво пайшло у Пераяслау шукаць апекі пад «высокай рукай цара маскоускаго»; янаж—нацыянальным і рэлігійным уціскам на Беларусі—прыгатавала грунт для пазьнейшай русіфікацыі, на якую навахвотней пайшлі праваслауныя беларусы і ужо саусім віпауна, у любьях з Сталыніным, «кідала жрэбій аб рызах» нашых;

яна-ж пакінула на сабе на Літве прыкрую памяць аб сквапнай дэнацыяналізацыі вышэйшых станау і--дзеі саусім нідауняго часу- аб змаганні з нацыянальным рухам сярод літоускаго духавенства.

Гэто гісторыя, катораяні легка забываецца, хаця-б навар і дакалея найменшыя запэуненна і катарую ні варто забываць. Бо нехто ні можа спасылацца, што гэто рабіу ні ен, а яго дзеряпны, а у тым ліку і увесь польскі народ: кожны народ мае на сваім чале таго, каго ен варт.

Аднак-жа такі стасунак да палітычных заграунеяняу ні павінен стаць на перашкодзе праудзівым народным жаданням агульнай згоды і добраго суседскаго жыцця. («Братство» трэба адкінуць, бо неяк заусёды здараецца, што з двух ці нескольких братоу, адзін робіцца «старшым» і пачынаецца крыуда).

Толькі да гэтаго трэба ісьці ні дарогай фальшываго ідэалізму у міжнародных стасунках, які дауно ужэ збанкрутавау у навуцэ і практыцэ, а дарогаю уразумення абапольных высікау ад тэй, ці іншай формы збліжэння с суседзямі. Тагды абгаварыушы наперад усе варункі, як гэта робіцца у гандлю, разам напрацавaушы, перакананушыся у чыстоце замерау з абаіх бакоу, можна дайсці і да узаемнаго зауфання.

А покуль што, у абэцны момэнт, калі іншчэ на тэррыторыі былых красау Польшчы і «С—западной области» Расійск. Імпэрыі толькі замыкаюцца у свае даунейшыя гісторычныя кітталты новыя дзержауныя адзінкі, калі агенты Польшчы, якія знайходзяцца у абозе коаліцыі, кнуюць тэмака працуныя гэтаму працэсу рухі, калі іншчэ ні пакінута думка *сілаю*,—агітаючыся на чыюсь сілу, хаця-бы і коаліцыі,—расьцягнуць будучае,—Польскае Каралеуства да мора кратэсты і літвіноу, і беларусау і украінцау, і усіх тых, праз чые землі мае праляглы гэта дарога, будуць і натуральнымі і зразумелымі, і... патрэбнымі для таго ідэалізму у міжнародных стасунках, па які так любяць апірацца і польскія і рускія палітыкі.

П.

Нататкі аб школьнай справе.

I.

Пры народным сэкрэтарыяце асьветы школьная камісія цяпер спэцыяльна працуе над перакладамі і над уложэннем школьных падручнікау па беларуску.

Пажаданым было-б, каб да восені былі гатовы кнігі хаця на першыя чатыры класы сярэдніх школ.

У гэтым кірунку ужо шмат зроблено у Закардонцай Беларусі: там выдано нескольки кніжак па закону Божаму (і для каталікоу і для праваслаўных) выдано нескалькі лемэнтароу, хрэстаматыі, задачнікау і другіх. Падгатаўляюцца да друку падручнікі па увесь курс гімназіі, аднак, на скольки нам ведама німа іншчэ добра апрацованай, с пэдагогічнаго пункту граматыкі—ключа у сіх беларускіх школьных падручнікау і для разумення мовы наагул. Без сістэматычнаго укладу граммачычных правіл, студзьеванне беларускай мовы у школах—рэч вельмі цяжкая. Кожнаму вучыцелю прыходзіцца быць філологом, трэба траціць шмат часу, каб з працау учоных беларусаведау выцягваць кіруючыя ніці для выкладау у школі.

Тыя спробы граматыкі якія дагэтуль вышлі з друку, напр. «Граматыка» Почобкі ні адказуюць патрэбі.

Для таго, каб гэты тормаз спыніць, варта было-б уладзіць беларускі філолочічны зьезд, які мог бы абгаварыць усю справу і шмат зрабіць у гэтым кірунку, што датычэ выясьнення правіл тэрмінологіі і г. і.

Што датыча граматычнай тэрміналёгіі, то па наш погляд, там, дзе болей апрацованыя за нашу, мовы ужываюць агульную навуковую тэрмінологію і мы ні павінны ўцякаць ад яе. Так сама ні сьлед чужацца тэрмінау падобных да расійскіх або польскіх. Усе славянскія мовы па большасьці маюць адны і тыя самыя корні. Можа быць с лёгкасьцю даказано, што расійская і польская мовы шмат прысвоілі сабе і беларускіх слоў, дзеля чаго нам часта—густа здаецца, што тое ці іншае слово ні наша, але польскае ці рускае, хаця прычына у тым, што гэтае слово жыўцом вырвано у нас нашымі мацнейшымі *славянскімі братамі*.

Іншэ колькі слоў аб хрэстаматыі: трэба каб тыя, хто займаецца не складаннем выкарысталі пры гэтым найлепшае з найбагатшай беларускай міфологіі і гісторыі: казкі, падання, летапісныя апаведання і інш., каб хрэстыматыя будзіла у дзецях нацыянальны патрыотычны дух.

З. Бядуля.

На беларускім шляху.

Учора 14 мая с Кіева у Менск прыбыу старшыня дэлегацыі Беларускай Рэчы Паспалітай для ўвезніх перагаворау на Украіне яг. А. І. Цьвікевіч.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН, 11/VI. Лік палонных, французау і ангельцау, захопленых нямецкімі войскамі ад 21 марца на Заходнім фронце, навялічыўся да 205.000 з лішкам, так сама узрос лік захопленых узброяу. Ен да гэтаго часу раўняуся 2.250. Дзэржавы Згоды страцілі па працягу 270 кіламэтрау увесь матэрыял, знаходзіушыся у акопах, бязлічаныя муніціоныя склады, дэпо і жалезна-дарожны матэрыял. Урон нанесены войскамі заходных хаўрусьнікау, даходзіць каласальных цыфрау.

БЭРЛІН 11/VI. Як паведамляе газэта «Фінанціал Нью Таймс» з Бразыліі, дзеля нідахвату у тоннажы, ні было мажлівасьці транспора апошняго ураджаю кавы, ўсяго 18 міліёнау мяшкоў. С Філіпінскіх выспау так сама німа мажлівасьці перагрузіць продукты ураджаю, ад чаго высьпы перажываюць экономічны крызіс.

БЭРЛІН 12/VI. С паказаннау палонных выясняецца, што у ангельскай арміі нізадаволенасьць францускім камандаваннем усё болей павялічываецца. Ангельцы, можа быць, іншчэ прымірaліся-б з вярхоўным камандаваннем французау, кабы яно павало хаўрусныя вой-

скі да перамогі; але дзеля таго што Фош ні дабіўся лепшых рэзультатаў чым Файг, ангэльцы ўзваліваюць на французаў віну за апошнія страты на р. Эн. У новых пазыцыях, куды былі пераведзены ангельцы, ніхто ні мог орыентовацца, дзеля таго, што усе указанні і вызначэнні былі на францускай мові, нізнаёмай ангельцам. Французкія жа ваенныя ўласьці катэгарычна забаранілі замяніць іх ангельскімі. Апрача таго ніхто ні умеў дзействаваць французкімі ручнымі бомбамі. Шмат рагоў ангельскія палонныя вось што газарылі: «Мы тлумачым нашэ паражэнне толькі тымі прычынамі, што мы знаходзіліся пад французкім камандаваннем».

ЛЕНДАН 11/VI. Дублінская корпорацыя, згодна газ. «Дэйлі Мэйль», выказывае у рэзалюцыі пратэст проціў ганебнаго ніспраўядліваго паступку брытанскаго ураду, заарэштоваўшаго 88 ірляндцаў мушчын і кабет, знаходзячыхся цяпер у рожных ісправіцельных домах Англіі, і затым проціў кепскаго безчалавечаго з імі звертання. Ім забаронено мець зносіны с сваімі семьямі, аб каторых шмат з іх ні ведае дзе знаходзюцца.

РОТТЭРДАМ 11/VI. У ніжней палаце прэдстаўнік ураду павядоміў, што ангельскай дэлегацыяй у Гаазе атрымано указанне пачаць з Боўгарыяй перэгаворы на шырокім базісе аб аснаўных умовах згоды адсылкі ангельскіх і баўгарскіх ваенна-палонных на бацькаўшчыну.

„Вільня—Менск“.

Устроеная пад гэтакай назваю віленскім выдаўніцтвам «Ztg. d. 10 Armee» выстаўка у Вільні, сьцягнула да сябе увагу усіх віленскіх газэт. Ва ўсіх іх адзначана вялікая цікавасьць выстауленых рэчаў і хаця, як кажа «Dz. Wil.», «рамы выстаўкі намечаны былі за надта шырока,... каб маглі быць споуненымі, зласіча у такі ніпармальны, як цяперашні, час,... але як фрагмэнт (як урывак таго што можна выставіць,)Р. выстаука варта таго каб на яе паглядзелі усе хто любіць нашу мінуўшчыну з яе цэннымі памяткамі». Падаём з «Гомана» - больш падробнае апісанне:

«Ні гледзячы на тое, што выстаўка гэная—нівялічкая, аднак, яна ў мініятуры дае даволі разнастаронны абраз артыстычна-рамесьніцкага творства мінулых лет».

«Найстарэйшыя рэчы—гэта памяткі па князёх беларускіх—сыгнэты, крыжы, напалавіну паганскія «зьмеявікі», пачынаючы ажно ад 1000-га году. Цэлы рад памятак з 11, 12, 13, 14 і т. д. вякоў. Далей—рукапісныя сьвятыя кнігі сьперша ў б[illegible]скай мове з беларускімі [illegible] (ад 1400 году), пасьля —у беларускай, с пекна маляванымі міньятурамі, (зусім напамінаючымі фрэскі ў Троцкім замку) пісаныя пекным пісьмом. Асаблівую ўвагу зварочывае арабскі рукапісь—тлумачэнні Корану *на беларускую мову*, толькі пісаныя арабскімі літэрамі (с «Сорак-Татар», пад Вільняй, 16—17 ст.). А побач—першы друк кірыліцай с 1491 году Швэйтопольта Фіоля с канцом у беларускай мове; тут-жа —знамяніты «Літоўскі Статут», друкаваны па-беларуску ў 1588 г.—у тэй самай мове, ў якой быў напісан. Чысьленыя дакумэнты—княжэўскія і каралеўскія ўсе пісаныя па-беларуску, пачынаючы ад XV сталецця. Шыхаваныя рысункі, багатая колекція антымінсаў, малюнкі. Старыя-старыя ткані купштоўнае работы, слаўныя слуцкія паясы; шляхоцкія і селянскія опраткі; нокалькі сот беларускіх селянскіх паясоў. Багата золатам гафтаваныя касьцельныя стулы, арнаты, накрыцці ад келіхаў; касьцельнае срэбра. Старыя срэбныя чаркі, кубкі і т. п.—работа віленскіх рамесьнікаў. Цыновае судзьдзе, рамкі і інш. Рэзьба з дрэва—фігура Пана Езуса, Маці Божае, сьвятых—работа беларускіх селян. Шкляныя вырабы с краёвых гут. Кахлі і іншые вырабы з гліны. Цікаўны каваныя жалезам скрыні. Панцыры і шаломы; рыцарскі меч с XV ст. Поўны касьцюм так-званага «літоўскага» уланскага палка, у каторым служылі спэцыяльна беларусы. Памяткі па беларускім войску. Штандар места Вільні і Троцкага замку. Пляны і віды Вільні. Урэшці—чысьленыя фотаграфіі тыпаў беларускіх, опратак, старых беларускіх будоўляў з дрэва і цэглы—сьвятынь, замкаў, дамоў старасьвецкіх і інш. А усё вельмі пекна і ў ладзе разложэно і відам сваім робіць дужа прыемнае ўражэнне.

Глаўная часць выстаўленых памятак нашае мінуўшчыны—гэта плод доўгалетняе працы заслужонага беларускага археолога, п. Івана Луцкевіча. Часць экспонатаў сабрана у Вільні—з мествага архіву, касьцёлаў і цэркваў, кальвінскай і лютэранскай сьвятынь і ад прыватных асоб, часць прывезена з Менска—с цэркваў, с колекцій п.п. Вейссэнгофа, Уласава, Земкевіча, Віскэ і інш. Арганізацыей выстаўкі занялася рэдакцыя «Zeitung der 10. Armee» (п. п. Гэндрыок, Франц, Браммэр), асабліва-ж папрацаваў для яе бэрлінскі архэолёг, д-р Імпэль»).

Нікаторыя з злотніцкіх вырабаў, і паміж імі вялікая купель з лютэранскай кірхі у Вільні, а так сама і старая акутая жалезам, з пекным замком, скрыня, узятая з ратушы, ёсьць, як кажа «Новый Вѣстнік» абразкамі працы нямецкіх майстраў, пераехаўшых у Вільню з Кэнізбергу, Гданску і Рыгі, што даводзіцца ні толькі іменнымі надпісамі майстроў на самых вырабах, але і цэхавымі кнігамі м. Вільні з XVII в. І аднак яны здолалі стварыць рэчы, маючыя свой адменны—«Віленскі», як кажа газэта, стыль.

«Той хто кіруючыся «Путеводтдіелем» уложанным др-м. Іппелем сер'ёзна займецца выстаўкай, вынясе з яе шмат новых уражэнняў і дадасьць шмат чаго новаго да свайго знання»—кажа „Н. В.“.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Бацькам і жонам ваенна-палонных 13-го і 14-го чэрвеня выдаваліся у б. меськім харчовым камітэці (Юрзуская, 2) і у членау камісіі, выбраны 9 чэрвеня, дармовыя рэгістацыйныя карточкі дзеля запоунення павядомасьцямі аб краўных ваенна-грамадзка-палонных у лагерах Гэманіі і хаурусных з ею дзержаў.

Запоуненыя картачкі будуць прынімацца у азначэных мейсцах ад 17-го па 23-е чэрвеня у альфабэтным парадку, с платай ад кожнаго заявіцеля 50 кап. на кацэлярскія расходы.

Рэгістрацыя вядзецца дзеля хадатайства перад нямецкімі уласьцямі аб звораце ваенна-палонных у Расію.

Выдача хлебнаго пайка—3 фунты на 3 дні служачым і рабочым Л. Р. ж. д. с саей каапэратыунай крамы, па цане 60 к. за фунт, дзеля браку мучных запасау часова прыастанауліваецца.

Епархіяльны зьезд духавенства, па прапанаванню епіскапа Гэоргія, усе-ж такі адбудзецца у чэрвені, хаця кансысторыя проціу зьезду.

На гэтым зьездзі будуць разьбірацца вельмі важныя пытанні:

а) аб рэформе кансісторыі, с тым, што яна перэіменовываецца у епархіяльную раду на выбарных асновах, уключаючы сюды чатырох чыноу і сэкрэтара.

б) аб злучэнні трох духоуных школ—пінскай, слуцкай і менскай—у адну *менскую*, разумеіцца з павялічэнным масштабам і праграммай.

в) аб злучэнні парычскай жаноцкай духоунай школы і б. мужской (цяпер 8-мі кляс—жан.) гімназія у адну менскую, з другімі праграммамі і духам адукацыі.

г) аб матэрыяльна-праваВым становішчы духавенства і іниш.

Рэмонт юбілейнаго дома, перайшоушаго пад кірауніцтво Беларускаго Народнаго Прэдстауніцтва, заканчываецца сягоння, 15 чэрвеня.

Адчыненне дома пад беларускім штандарам адбудзецца пасьля прыезду Р. Скірмунта з Украіны і сконтструіравання беларускаго кабінэту міністрау каторы будзе там кватэраваць.

Падвальнае памешканне астаецца па ранейшаму для коопэратывы губ. вучыцельскаго хаурусу.

К весткам аб перэвароце у Маскве перэдаець прэдстаўнік эвакуаваннаго у 1915 г. у Казань менскаго аддзелу гасуд. банку, што скарбы і менне Белакаменнай пасьпешна перавазіліся у Ніжні і Казань ніпрарыунымі паездамі яшчэ два тыдні таму назад.

Ужо тады азнакі перэвароту па яго славах, былі відны.

Безбілетныя пасажыры («зайцы»), вышуканыя нямецкімі уласьцямі у паездах мейсцовых жалезных дарог, штрафуюцца па 1 р. 75 к. за кожную станцію плюс 20 руб. дапауніцельнаго збору.

Расквартыраванне у Менску нямецкіх палкавых часьцей—пытанне найбліжэйшых дзен.

Тыфозных занядужаных у аддзелу крымінал. паліцыі і губ. турме аказаліся усяго-паусяго два.

Аснавацельная дэзінфэкція і ізоляція зроблены зараз жа.

У месьці сярод насялення занядужэнне тыфам усе меней, як паказывае вучастковы санітарны надзор.

Да курсу царскаго рубля. Можэм павядоміць, што за апошнія дні банкірскімі і камісіоннымі канторамі, а так сама махэрамі ен абменіваецца—за 100 цар.—110 акуп.

Становішчо царскаго рубля у Вільні кепскае: за гэту манэту (пры браку акупацыйных) апошнім часам, як апаведаюць прыехаушыя адтуль асобы, ні даюць і ні шклянкі гэрбаты.

У Менску ад сягоняшняго дня, 15 чэрвеня, усе тавары павінны прадавацца на імпэрскія маркі або акупац. грошы па курсу 2-х марак за акупацыйны рубель. Усе здзелкі на расійскіх грашах ні маюць ні якой моцы. Толькі гэрманскія банкі і дозволенныя штабам арміі мейсцовыя банкі і крэдытныя установы маюць права прынімаць уклады нямецкімі імпэрскімі маркамі і выплачываюць іх так сама маркамі.

У «У. З. С. К. З. Ф.» прэдстаунік яго, б. загадчых 3-ім шавецкім рэпоровачным атрадам, выежджаушы у Расію у палковыя часьці, б. расквартэраванные у Слуцкім павеці, дзеля атабрання грошай па дакумэнтах аб пачынцы обуві у крэдыт, вярнууся.

Усяго ім узыскано с полкавых часьцей, замест мільена, толькі 200,000 р. з лішком.

Падрахунак канеу, дзеля абезпячэння патрэбнаго ліку фуража, будзе зроблены на конным рынку ад 17-го па 24-е чэрвеня.

Уласьнікі коней, ні вывеушыя іх будуць аштрафаваны да 1500 марак.

У кантрольным аддзелу меськай харчавой камісіі ад 13 чэрвеня робіцца абмен пасьвядчэнняу для асоб, адказаушыхся аттрымаць прадукты па бонах.

Пэнсія за май служачым меськ. самаупраулення выдано поунасьцю, ні гледзючы на беднасьць кассы.

Абецаныя нагр адныя пакуль што адсрочываюцца.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 13 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Часамі ажыўляючыя артылерыйскія мейсцовыя стычкі.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

Паўднёва захадней Нудайска французы вялі на абоіх старанах дарогі Руа-Эт-рэ-Ст. Дені поўторныя сільныя контратакі. З вялікімі стратамі быў адбіты і гэты напад.

Больш 60 разбітых браніров. аўтамабілеў ляжыць на полі бітвы. Па наступіўшых да гэтай пары вестках намі узято больш 150 гармат. Пры адбіванні непрыяцельскай контр-атакі некалькі з нашых арудзій, пасунуўшыхся да перадавое лініі, папалі у непрыяцельскія рукі.

Паўночней р. Эн нашы штурмовыя батальёны уварваліся у непрыяцельскія акопы; паўднёвей р. Эн мы атакавалі непрыяцеля пасьля сільнай артылерыйскай падгатоўкі адкінулі яго за сел. Аютры—Домнер. Паўночней Корсы непрыяцель ачысьціў Саварскую даліну. Мы узялі больш 1500 палонных.

Шмат раз паўтараныя непрыяцельскія атакі паўначней. Штат Тьэрры былі намі адбіты з вялізнымі для непрыяцеля стратамі.

За апошнія два дні намі зьбіты 35 непрыяцельскіх аэропланаў. Кап. Бергольд і лейт. Мепкгоф адтрымалі свае 33, обэрлейт. Шлейх свае 29 і 30, лейт. Фэлтьенс свае 20 і 21, кап. Рэйнгердт сваю 20 паветраныя перамогі.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

АБ УСІМ.

Літоускі нацыянальны штандар. «Літовус Аідас» жаліцца, што есьць яшчэ мейсцы, у каторых і да гэтаго часу ні знаюць, як выгледае літоускі штандар. Есьць два віды літоускіх штандароу. Літоускі дзержауны штандар мае краснае поле с белым літоускім рыцарам. Літоускі нацыянальны штандар састаіць с трох колерау разложаных гарызантальна: на вярху жоуты, у сяродзіне зялены а у нізу чырвоны. Апрача таго літоускі штандар. можа быць з рыцарам і без яго. Калі на штандары есьць рыцар, то ен цавінен быць на чырвоным полі, у левым верхнім вуглу альбо у сярэдзіне чырвонаго поля.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.